АПОСТАЛЬСКАЯ АДГАРТАЦЫЯ

# ***LAUDATE DEUM***

СВЯТОГА АЙЦА
**ФРАНЦІШКА**

ДА ЎСІХ ЛЮДЗЕЙ ДОБРАЙ ВОЛІ
АБ КЛІМАТЫЧНЫМ КРЫЗІСЕ

1. «Хвала Богу за ўсе Ягоныя стварэнні». Гэты заклік абвяшчаў св. Францішак Асізскі сваім жыццём, песнямі і справамі. Так ён прыняў запрашэнне біблійных псальмаў і паказаў чуллівасць Езуса да стварэнняў Свайго Айца: «Паглядзіце на палявыя лілеі, як яны растуць: ні працуюць, ні прадуць. Кажу вам, што нават Саламон ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як адна з іх» (Мц 6, 28-29). «Ці ж не пяць вераб'ёў прадаецца за два асы? І ніводзін з іх не забыты перад Богам» (Лк 12, 6). Як жа не захапляцца гэтай пяшчотай Езуса да ўсіх стварэнняў, якія спадарожнічаюць нам на шляху?

2. Мінула ўжо восем год ад публікацыі энцыклікі *Laudato si'*, у якой я хацеў падзяліцца з усімі вамі, братамі і сёстрамі нашай церпячай планеты, сваёй глыбокай занепакоенасцю нашым супольным домам. Аднак з цягам часу я зразумеў, што мы не рэагуем як належыць, бо свет, у якім мы жывём, разбураецца і, магчыма, набліжаецца да крытычнай кропкі. Звыш таго, няма сумневаў, што уплыў кліматычных зменаў будзе ўсё больш шкодзіць жыццю многіх людзей і сем'яў. Мы будзем адчуваць іх наступствы ў сферы аховы здароўя, занятасці, доступу да рэсурсаў, жылля, вымушанай міграцыі і інш.

3. Гэтая глабальная сацыяльная праблема цесна спалучана з годнасцю чалавечага жыцця. Біскупы Злучаных Штатаў вельмі добра падкрэслілі сацыяльнае значэнне нашага клопату аб кліматычных зменах, які выходзіць па-за межы выключна экалагічнага падыходу, бо «наш клопат адзін аб адным і клопат аб Зямлі моцна звязаныя між сабой. Змена клімату – адзін з

галоўных выклікаў, якія стаяць перад грамадствам і сусветнай супольнасцю. Ад наступстваў кліматычных зменаў церпяць найбольш уразлівыя людзі, як у сваім краі, так і па ўсім свеце» [1]. У некалькі словах тое самае прамовілі і біскупы, якія былі на Сінодзе па Амазоніі: «Атакі на прыроду маюць наступствы для жыцця народаў» [2]. І, каб выразна сказаць, што ўжо не ідзе гаворка аб другарадным ці ідэалагічным пытанні, але аб драме, якая закранае ўсіх, афрыканскія біскупы сцвердзілі, што кліматычныя змены дэманструюць «шакуючы прыклад структурнага граху» [3].

4. Разважанні і дадзеныя, якія нам удалося сабраць за апошнія восем год, дазваляюць нам патлумачыць і дапоўніць тое, што мы маглі сцвярдзіць раней. Па гэтай прычыне, а таксама таму, што сітуацыя робіцца ўсё больш вострай, я б хацеў падзяліцца з вамі гэтым зместам.

**1. Глабальны кліматычны крызіс**

5. Нягледзячы на ўсе спробы адмаўляць, хаваць, маскіраваць ці рэлятывізаваць праблему, прыкметы кліматычных зменаў становяцца ўсё больш відавочнымі. Ніхто не можа ігнараваць таго, што ў апошнія гады мы былі сведкамі экстрэмальных з’яваў, частых перыядаў анамальнай спякоты, засухі ды іншых скаргаў з боку Зямлі, якія варта прызнаць толькі некаторымі адчувальнымі праявамі маўклівай хваробы, якая закранае нас усіх. Гэта праўда, што не ўсе катастрофы можна прыпісаць глабальным кліматычным зменам. Аднак можна быць упэўненым, што некаторыя змены клімату, справакаваныя чалавекам, значна павялічваюць верагоднасць больш частых і інтэнсіўных экстрэмальных з’яваў. Таму мы ведаем, што кожны раз, калі глабальная тэмпература павялічваецца на 0,5° C, узрастае інтэнсіўнасць і частата праліўных дажджоў і паводак у адных раёнах, моцных засух у другіх, экстрэмальнай спёкі ў адных рэгіёнах і моцных снегападаў у іншых [4]. Калі дагэтуль даводзіцца перажываць хвалі спякоты некалькі разоў на год, то што будзе, калі тэмпература павялічыцца на 1,5° C? І чакаць засталося нядоўга. Такая спякота будзе здарацца значна часцей, а яе інтэнсіўнасць будзе нарастаць. Калі тэмпература павысіцца на 2 градусы, ледзяное покрыва Грэнландыі і большай часткі Антарктыды цалкам растане [5], што будзе мець велізарныя і вельмі сур’ёзныя наступствы для ўсіх.

*Супраціў і непаразуменні*

6. У апошнія гады хапала людзей, якія стараліся прыменшыць значэнне гэтых назіранняў. Яны спасылаюцца на нібыта навуковыя дадзеныя, – напрыклад, што на планеце заўсёды былі і будуць перыяды пахаладання і пацяплення. Яны ігнаруюць іншы важны факт: тое, што мы зараз назіраем, – гэта не звычайнае паскарэнне пацяплення, але такое хуткае, што патрабуецца ўсяго толькі адно пакаленне, а не стагоддзі ці тысячагоддзі, каб яго заўважыць. Чалавек можа лёгка адсачыць павышэнне ўзроўню мора і раставанне леднікоў на працягу ўласнага жыцця, і цалкам верагодна, што праз некалькі гадоў многім людзям з прычыны гэтых падзей давядзецца перасяліцца.

7. Каб высмеяць тых, хто кажа пра глабальнае пацяпленне, адзначаюць, што рэгулярна здараюцца перыяды моцнага холаду. І не згадваюць, што гэтыя і іншыя незвычайныя сімптомы – гэта толькі альтэрнатыўныя праявы той самай прычыны: глабальнага дысбалансу, выкліканага пацяпленнем планеты. Засухі і паводкі, высыханне азёраў і перасяленне цэлых супольнасцяў з прычыны цунамі або паводак, маюць, па сутнасці, адну і тую ж крыніцу. З іншага боку, калі кажам пра глабальную з’яву, не можам блытаць яе са спарадычнымі здарэннямі, якія ў асноўным тлумачацца лакальнымі фактарамі.

8. Недахоп інфармацыі прыводзіць да таго, што маштабныя кліматычныя прагнозы, якія ахопліваюць працяглыя перыяды – прынамсі, дзесяцігоддзі – ставяцца нароўні з прагнозамі надвор’я, якія могуць ахопліваць толькі некалькі тыдняў. Калі мы кажам пра кліматычныя змены, то маем на ўвазе глабальную рэальнасць – з пастаяннымі лакальнымі ваганнямі, – якая доўжыцца некалькі дзесяцігоддзяў.

9. Намагаючыся спрасціць рэальнасць, некаторыя людзі ўскладаюць адказнасць на бедных, быццам у іх зашмат дзяцей, і нават спрабуюць вырашыць праблему шляхам калецтва жанчын з менш развітых краінаў. Як заўсёды, здаецца, што ва ўсім вінаватыя беднякі. Але насамрэч невялікі працэнт багатага насельніцтва свету забруджвае больш, чым 50 працэнтаў найбяднейшага, а выкіды на душу насельніцтва ў багацейшых краінах значна большыя, чым у бедных [6]. Як мы можам забыцца, што Афрыка, дзе жыве больш за палову найбяднейшага насельніцтва свету, нясе адказнасць за мінімальную частку выкідаў за ўсю гісторыю?

10. Часта таксама можна пачуць, што высілкі, накіраваныя на аслабленне кліматычных зменаў праз змяншэнне выкарыстання выкапнёвага паліва і распрацоўку больш чыстых відаў энергіі прывядзе да зніжэння колькасці працоўных месцаў. На самай справе адбываецца іншае: мільёны людзей губляюць працу з прычыны разнастайных наступстваў кліматычных зменаў. У выніку пад’ёму ўзроўню мора, засух і многіх іншых з’яваў, якія ўплываюць на планету, без працы застаецца вельмі шмат людзей. І наадварот, пераход да аднаўляльных відаў энергіі пры правільным кіраванні, а таксама высілкі па адаптацыі да шкоды, якую прынесла змяненне клімату, могуць стварыць незлічоную колькасць працоўных месцаў у розных сектарах. Таму неабходна, каб палітыкі і бізнес-лідэры ўжо цяпер паклапаціліся пра гэта.

*Чалавечыя прычыны*

11. Ужо немагчыма далей сумнявацца ў чалавечых – «антрапалагічных» – прычынах кліматычных зменаў. Паглядзім, чаму. Канцэнтрацыя парніковых газаў у атмасферы, якая выклікае глабальнае пацяпленне, была стабільнай да дзевятнаццатага стагоддзя – ніжэй за 300 частак на мільён па аб’ёме. Аднак у сярэдзіне мінулага стагоддзя, па меры развіцця прамысловасці, выкіды пачалі павялічвацца. За апошнія пяцьдзясят гадоў гэты рост значна

паскорыўся, як пацвердзіла абсерваторыя Маўна-Лоа, якая штодзённа праводзіць вымярэнні вуглякіслага газу з 1958 года. Пакуль я пісаў *Laudato si'*, аб'ёмы дасягнулі гістарычнага максімуму – 400 частак на мільён, а ў чэрвені 2023 года дасягнулі 423 частак на мільён [7]. Больш за 42% агульных нета-выкідаў з 1850 года прыпадаюць на перыяд пасля 1990 года [8].

12. Адначасова мы заўважаем, што за апошнія пяцьдзясят гадоў тэмпература расла з беспрэцэдэнтнай хуткасцю, большай, чым за апошнія дзве тысячы гадоў. У гэты перыяд тэндэнцыя пацяплення складала 0,15°C за дзесяцігоддзе, што ўдвая больш за апошнія 150 гадоў. З 1850 года глабальная тэмпература паднялася на 1,1°C, а гэта яшчэ мацней паўплывала на палярныя рэгіёны. Пры такой хуткасці цалкам магчыма, што ўсяго праз дзесяць гадоў мы дасягнем максімальнай мяжы ў 1,5° C [9]. Павышэнне адбылося не толькі на зямной паверхні, але і на некалькі кіламетраў вышэй у атмасферы, на паверхні акіянаў і нават на сотні метраў углыб. Павялічылася таксама закісленне акіянаў і знізіўся ўзровень кіслароду. Леднікі адступаюць, снежнае покрыва змяншаецца, узровень мора пастаянна падымаецца [10].

13. Не ўдасца прыхаваць сувязь гэтых глабальных кліматычных з'яў і паскоранага павелічэння выкідаў парніковых газаў, асабліва з сярэдзіны XX стагоддзя. Пераважная большасць вучоных, якія займаюцца кліматам, падтрымліваюць гэтую карэляцыю, і толькі вельмі невялікі працэнт з іх імкнецца адмаўляць доказы. На жаль, кліматычны крызіс не цікавіць вялікія эканамічныя дзяржавы, якія клапоцяцца аб атрыманні максімальна магчымага прыбытку пры мінімальных выдатках і ў самыя кароткія тэрміны.

14. Я вымушаны зрабіць гэтыя ўдакладненні, якія могуць здавацца відавочнымі, з прычыны некаторых пагардлівых і наўрад ці разумных меркаванняў, якія знаходжу нават у Каталіцкім Касцёле. Аднак мы больш не можам сумнявацца, што прычынай незвычайнай хуткасці такіх небяспечных зменаў з'яўляецца бясспрэчны факт: неймавернае развіццё, звязанае з неўтаймаваным умяшаннем чалавека ў прыроду цягам апошніх двух стагоддзяў. Падзеі прыроднага паходжання, якія звычайна выклікаюць пацяпленне, такія як вывяржэнне вулканаў і іншыя, недастаткова, каб растлумачыць тэмп і хуткасць зменаў цягам апошніх дзесяцігоддзяў [11]. Рост сярэдніх тэмператур паверхні можна растлумачыць толькі з улікам павелічэння выкідаў парніковых газаў.

*Страты і рызыкі*

15. Некаторыя наступствы кліматычнага крызісу ўжо незваротныя, па меншай меры, на працягу некалькіх сотняў гадоў: гэта павышэнне глабальнай тэмпературы акіянаў, іх закісленне і памяншэнне кіслароду. Воды ў акіянах характарызуюцца цеплавой інерцыяй, і для нармалізацыі іх тэмпературы і салёнасці спатрэбяцца стагоддзі, што будзе ўплываць на выжыванне многіх відаў. Вось толькі адна са шматлікіх прыкмет таго, што іншыя стварэнні

гэтага свету перасталі быць нашымі спадарожнікамі, а сталіся нашымі ахвярамі.

16. Тое ж можна сказаць і пра памяншэнне ледзянога покрыва. Раставанне полюсаў нельга будзе адмяніць на працягу сотняў гадоў. Што тычыцца клімату, ёсць фактары, якія захоўваюцца доўгі час, незалежна ад падзей, якія іх выклікалі. Па гэтай прычыне мы цяпер не можам спыніць велізарную шкоду, якую справакавалі. Мы ледзь паспяваем прадухіліць яшчэ больш трагічную шкоду.

17. Некаторыя апакаліптычныя дыягназы часта здаюцца неразважнымі або недастаткова абгрунтаванымі. Але з гэтай прычыны мы не павінны ігнараваць рэальную небяспеку таго, што мы набліжаемся да крытычнай кропкі. Невялікія змены могуць выклікаць важкія, непрадбачаныя і, магчыма, ужо незваротныя змены за кошт інерцыйных фактараў. У канчатковым выніку гэта прывядзе да лавінападобнага каскаду падзей. У падобных сітуацыях заўсёды бывае позна, бо ніякае ўмяшанне не зможа затрымаць пачаты калісьці працэс. Вяртання адтуль няма. Мы не можам з упэўненасцю сказаць, што ўсё гэта адбудзецца, зыходзячы з цяперашніх умоў. Але магчымасць застаецца, калі мы ўлічым уплыў працэсаў, якія ўжо маюць месца і павялічваюць «адчувальнасць» клімату, такія як змяншэнне ледзянога покрыва, змены ў акіянскіх плынях, высечка трапічных лясоў, раставанне вечнай мерзлаты ў Сібіры і інш. [12].

18. Такім чынам, тэрмінова патрабуецца больш шырокае бачанне, якое дазволіць нам не толькі захапляцца цудамі прагрэсу, але таксама звяртаць сур’ёзную ўвагу на іншыя наступствы, якія стагоддзе таму нельга было нават уявіць. Ад нас не патрабуецца нічога больш, акрамя адказнасці за спадчыну, якую мы пакінем пасля сябе ў гэтым свеце.

19. Урэшце можам дадаць, што пандэмія Covid-19 выявіла цесную сувязь жыцця чалавека з жыццём іншых жывых істотаў і з прыродным асяроддзем, але асаблівым чынам пацвердзіла, што падзеі ў адной частцы свету маюць наступствы для ўсёй планеты. Гэта дазваляе мне паўтарыць два перакананні, якія я падкрэсліваю зноў і зноў: «усё звязана» і «ніхто не ўратуецца сам».

## 2. Рост тэхнакратычнай парадыгмы

20. У *Laudato si'* я прапанаваў кароткае тлумачэнне тэхнакратычнай парадыгмы, якая ляжыць у аснове сучаснага працэсу дэградацыі навакольнага асяроддзя. Гэта «скажоны спосаб разумення жыцця і чалавечай дзейнасці, які супярэчыць рэчаіснасці, аж да яе знішчэння» [13]. У асноўным, маецца на ўвазе мысленне «як быццам бы рэчаіснасць, дабро і праўда спантанна вынікаюць з самой моцы тэхналогіі і эканомікі» [14]. У якасці лагічнага наступства «так лёгка можна перайсці да ідэі бясконцага ці неабмежаванага росту, якая так моцна захапіла эканамістаў, тэарэтыкаў фінансаў і тэарэтыкаў тэхналогіі» [15].

21. У апошнія гады мы змаглі пацвердзіць гэты дыягназ, нават калі адначасова сталі сведкамі новага прагрэсу вышэйзгаданай парадыгмы. Штучны інтэлект і апошнія тэхналагічныя інавацыі грунтуюцца на ідэі чалавека без абмежаванняў, здольнасці і магчымасці якога можна бясконца пашыраць дзякуючы тэхналогіям. Такім чынам тэхнакратычная парадыгма пачварна сілкуецца сама сабой.

22. Без сумневу, прыродныя рэсурсы, неабходныя тэхналогіям, такія як літый, крэмній і многія іншыя, не бязмежныя, аднак большай праблемай з’яўляецца ідэалогія, якая ляжыць у аснове апантанасці: павялічыць людскую моц за межы ўсяго, што можна сабе ўявіць, перад якой рэчаіснасць па-за чалавекам – гэта проста рэсурс у яго распараджэнні. Усё, што існуе, перастае быць дарам, які трэба шанаваць, цаніць і берагчы, а ператвараецца ў раба, ахвяру любых капрызаў чалавечага розуму і яго здольнасцяў.

23. Страшна сабе ўявіць, што магчымасці, пашыраныя тэхналогіямі, «даюць магчымасць тым, хто мае веды – а перадусім эканамічную ўладу, каб іх выкарыстоўваць – незвычайнае панаванне над усім чалавецтвам і над усім светам. Чалавецтва ніколі не мела такой улады над сабою і не мае гарантыі, што добра яе выкарыстае, асабліва беручы пад увагу спосаб яе выкарыстання. [...] У чыіх руках знаходзіцца і ў якія рукі можа трапіць такая вялікая ўлада? Жахліва грозным з’яўляецца яе сканцэнтраванасць у руках малой часткі чалавецтва» [16].

*Пераасэнсаванне нашага выкарыстання ўлады*

24. Не кожны рост моцы азначае прагрэс для чалавецтва. Дастаткова  падумаць пра «выдатныя» тэхналогіі, якія выкарыстоўваліся для згубы насельніцтва, скідання атамных бомбаў і знішчэння этнічных груп. У гісторыі былі моманты, калі нашае захапленне прагрэсам не дазваляла бачыць жах яго наступстваў. Але гэтая рызыка існуе заўсёды, бо «вялізнаму тэхналагічнаму росту не сапутнічала развіццё чалавечай істоты ў сферы адказнасці, вартасці і сумлення. [...] У гэтым сэнсе свабода чалавека знаходзіцца ў небяспецы і з’яўляецца безабароннай перад сваёй уласнай моцаю, якая няспынна расце, не маючы адпаведных прыладаў кантролю. Можа мець у распараджэнні знешнія механізмы, аднак трэба сцвердзіць, што не хапае ёй сёння адпаведнай грунтоўнай этыкі, культуры і духоўнасці, якія б сапраўды яе абмяжоўвалі і ўтаймоўвалі» [17]. Не дзіўна, што настолькі вялікая ўлада ў такіх руках здольная знішчыць жыццё, у той час як менталітэт, уласцівы тэхнакратычнай парадыгме, асляпляе нас і не дазваляе ўбачыць гэтую надзвычай цяжкую праблему сучаснага чалавецтва.

25. У адрозненне ад гэтай тэхнакратычнай парадыгмы мы кажам, што навакольны свет не з’яўляецца аб’ектам эксплуатацыі, неўтаймаванага выкарыстання, бязмежных амбіцый. Мы таксама не можам сказаць, што прырода з’яўляецца толькі «рамкай», у якой мы можам развіваць сваё жыццё і праекты, бо «мы ўключаны ў яе, з’яўляемся яе часткай і аказваем

узаемны ўплыў» [18], таму «не захапляемся светам звонку, але знутры» [19].

26. Гэта абвяргае погляд, нібы чалавек – чужынец, вонкавы фактар, здольны толькі нашкодзіць навакольнаму асяроддзю. Чалавек павінен быць прызнаны часткай прыроды. Чалавечае жыццё, розум і свабода – гэта элементы прыроды, якія ўзбагачаюць нашу планету і з'яўляюцца часткай яе ўнутранай працы і раўнавагі.

27. Па гэтай прычыне здаровае асяроддзе таксама з'яўляецца вынікам узаемадзеяння паміж людзьмі і навакольным светам, як гэта адбываецца ў культурах карэнных народаў і адбывалася на працягу стагоддзяў у розных рэгіёнах зямлі. Чалавечыя групы часта «стваралі» навакольнае асяроддзе [20], так ці інакш змяняючы яго, не разбураючы і не ставячы пад пагрозу. Вялікая праблема сучаснасці ў тым, што тэхнакратычная парадыгма знішчыла гэтыя здаровыя і гарманічныя адносіны. Аднак неабходнасць выйсці з гэтай парадыгмы, такой шкоднай і дэструктыўнай, не будзе палягаць на адпрэчванні чалавека, але на ўзаемадзеянні прыродных сістэм «з грамадскімі сістэмамі» [21].

28. Нам трэба пераасэнсаваць пытанне чалавечай улады, яе значэнне і межы. Сапраўды, нашая моц рэзка ўзрасла за некалькі дзесяцігоддзяў. Мы дасягнулі надзвычайнага і эфектнага тэхналагічнага прагрэсу і не ўсведамляем, што адначасова сталі вельмі небяспечнымі, здольнымі паставіць пад пагрозу жыццё многіх істотаў і наша ўласнае выжыванне. Сёння варта паўтарыць іранічны каментар Салаўёва пра «эпоху, якая была настолькі прагрэсіўнай, што фактычна аказалася апошняй» [22]. Нам патрэбна яснасць і сумленнасць, каб своечасова распазнаць, што нашая моц і прагрэс, які мы ствараем, абарочваюцца супраць нас [23].

*Этычнае джала*

29. Этычная дэградацыя рэальнай улады маскіруецца маркетынгам і хлуслівай інфармацыяй, карыснымі інструментамі ў руках тых, хто валодае большымі рэсурсамі, каб выкарыстоўваць іх для ўплыву на грамадскую думку. З дапамогай гэтых механізмаў кожны раз, калі плануецца ажыццявіць праект, які значна паўплывае на навакольнае асяроддзе і павысіць узровень забруджвання, жыхароў гэтай мясцовасці ашукваюць, кажучы пра лакальны прагрэс, які можа пачацца, ці пра магчымасці эканамічнага росту, працаўладкавання і павышэння чалавечага патэнцыялу, якія праект прынясе іх дзецям. Але насамрэч няма ніякай сапраўднай зацікаўленасці ў будучыні гэтых людзей, бо ім не кажуць выразна, што ў выніку ім застанецца спустошаная зямля, горшыя ўмовы жыцця, пакінуты і менш прыдатны для засялення ландшафт, якому не стае жыцця, радасці суіснавання і надзеі; у дадатак, яшчэ і глабальная страта, якая прынясе шкоду многім іншым людзям.

30. Варта толькі ўспомніць аб імгненным энтузіязме, які выклікаюць грошы, атрыманыя за захоўванне ядзерных адходаў у тым ці іншым месцы. Дом, набыты за гэтыя грошы,

ператварыўся ў магілу праз хваробы, якія там распаўсюдзіліся. І я гэта кажу не з празмернай фантазіі, але на аснове таго, што мы бачылі. Можна было б сказаць, што гэта крайні прыклад, але тут нельга гаварыць пра «невялікія» страты, бо менавіта назапашванне страт, якія лічацца дапушчальнымі, прывяло нас да сітуацыі, у якой мы цяпер знаходзімся.

31. Такая сітуацыя мае сувязь не толькі з фізікай і біялогіяй, але таксама з эканомікай і тым, як мы яе разумеем. Логіка максімальнай выгады пры мінімальных выдатках – пад выглядам рацыянальнасці, прагрэсу і ілюзорных абяцанняў – робіць немагчымым любы шчыры клопат пра наш агульны дом і любую сапраўдную зацікаўленасць у дапамозе бедным і патрабуючым, якіх адкідае нашае грамадства. У апошнія гады мы можам заўважыць, што, збянтэжаныя і зачараваныя абяцаннямі шматлікіх ілжывых прарокаў, бедныя самі часам становяцца ахвярамі падману свету, пабудаванага не для іх.

32. Таксама ўмацоўваюцца памылковыя ўяўленні аб канцэпцыі «мерытакратыі», якая пачынае разглядацца як «заслужаная» чалавечая ўлада, якой усё павінна падпарадкоўвацца; перавага на баку тых, хто нарадзіўся з лепшымі ўмовамі для развіцця. Здаровы падыход да вартасці напружанай працы, развіцця сваіх здольнасцяў і годнага пахвалы духу ініцыятывы – гэта адно, але калі не імкнуцца да сапраўднай роўнасці магчымасцяў, «мерытакратыя» можа лёгка стаць шырмай, якая яшчэ больш пашырае прывілеі тых нешматлікіх, якія маюць вялікую ўладу. Па гэтай скажонай логіцы, навошта ім непакоіцца шкодай нашаму агульнаму дому, калі яны адчуваюць сябе надзейна абароненымі праз фінансавыя рэсурсы, якія яны зарабілі сваімі здольнасцямі і намаганнямі?

33. У сумленні, з улікам таго, што дзеці будуць расплачвацца за шкоду, учыненую гэтым, непазбежна ўзнікае пытанне аб сэнсе: «У чым сэнс майго жыцця? Які ўрэшце сэнс часу, адведзенага мне на гэтай зямлі? І ў чым канчатковы сэнс усёй маёй працы і высілкаў?».

### 3. Слабасць міжнароднай палітыкі

34. Нягледзячы на тое, што «гісторыя паказвае сваю схільнасць да паўтарэння. [...] Кожнае пакаленне павінна атаясамлівацца з барацьбой і дасягненнямі папярэдніх пакаленняў і абіраць напрамак да яшчэ больш узнёслых мэтаў. Вось шлях. Нельга дасягнуць дабра, а таксама любові, справядлівасці і салідарнасці раз і назаўсёды; вы павінны здабываць іх кожны дзень» [24]. Для дасягнення цвёрдых і трывалых поспехаў я хацеў бы настойваць на тым, што перавагу трэба аддаваць «шматбаковым пагадненням паміж дзяржавамі» [25].

35. Не варта блытаць мультылатэралізм з сусветнай уладай, сканцэнтраванай у адной асобе або ў эліце з празмернай уладай: «Калі мы гаворым пра магчымасць нейкай сусветнай улады, якая рэгулюецца законам, нам не абавязкова думаць пра асабовы аўтарытэт» [26]. Мы гаворым перш за ўсё пра развіццё «больш эфектыўных сусветных арганізацый, здольных забяспечваць глабальнае агульнае дабро, ліквідаваць голад і галечу

і абараніць асноўныя правы чалавека» [27]. Маецца на ўвазе, што яны павінны быць надзелены рэальнай уладай такім чынам, каб «забяспечваць» дасягненне пэўных істотных мэтаў. Такім чынам мог бы паўстаць мультылатэралізм, які не залежыў бы ад зменлівых палітычных умоў або інтарэсаў некалькіх асобаў і захоўваў устойлівую эфектыўнасць.

36. На жаль, глабальныя крызісы праходзяць марна, хоць маглі б стаць нагодай для ўвядзення карысных зменаў [28]. Так сталася падчас фінансавага крызісу 2007-2008 гадоў і паўтарылася падчас крызісу Covid-19. Бо «рэальныя стратэгіі, распрацаваныя ў выніку [тых крызісаў] ва ўсім свеце, спрыялі большаму індывідуалізму, большай дэзінтэграцыі і большай свабодзе для сапраўды моцных гэтага свету, якія заўсёды знаходзяць спосаб пазбегнуць страт» [29].

*Рэканфігурацыя мультылатэралізму*

37. Здаецца, задача сённяшняга дня заключаецца не столькі ў захаванні старой шматбаковасці, колькі ў тым, каб пераналадзіць і аднавіць яе ў святле новай глабальнай сітуацыі. Я запрашаю вас прызнаць, што «шматлікія таварыствы і арганізацыі ў рамках грамадзянскай супольнасці дапамагаюць кампенсаваць недахопы міжнароднай супольнасці, адсутнасць яе каардынацыі ў складаных сітуацыях, недастатковую ўвагу да асноўных правоў чалавека» [30]. Так, Атаўскі працэс супраць выкарыстання, вытворчасці і вырабу супрацьпяхотных мін з’яўляецца адным з прыкладаў, які паказвае, як грамадзянская супольнасць са сваімі арганізацыямі здольная ствараць эфектыўную дынаміку, чаго не можа Арганізацыя Аб’яднаных Нацый. Такім чынам, прынцып субсідыярнасці прымяняецца таксама да глабальных і мясцовых адносінаў.

38. У сярэднечасовай перспектыве глабалізацыя спрыяе спантаннаму культурнаму абмену, лепшаму ўзаемнаму пазнанню і працэсам інтэграцыі народаў. Гэта дазваляе мультылатэралізму фармавацца «знізу ўверх», а не толькі ў выніку рашэння уладных элітаў. Патрабаванні, якія ідуць з нізоў паўсюль, дзе актывісты з самых розных краін дапамагаюць і падтрымліваюць адзін аднаго, могуць у выніку аказаць ціск на крыніцы ўлады. Хочацца спадзявацца, што гэта адбудзецца ў дачыненні да кліматычнага крызісу. Па гэтай прычыне я паўтараю, што «калі грамадзяне не кантралююць палітычнай улады — агульнанацыянальнай, рэгіянальнай і мясцовай — то немагчыма таксама ліквідаванне экалагічных шкодаў» [31].

39. Постмадэрнісцкая культура спарадзіла *новае ўспрыняцце* тых, хто слабейшы і не мае вялікай улады, што спалучаецца з маім акцэнтаваннем у энцыкліцы *Fratelli tutti* прымату чалавечай асобы і абароны яе годнасці ў любых абставінах. Гэта яшчэ адзін спосаб заахвочвання да мультылатэралізму дзеля вырашэння сапраўдных праблем чалавецтва, гарантуючы перш за ўсё павагу да годнасці асобы так, каб этыка пераважала над мясцовымі або выпадковымі інтарэсамі.

40. Гаворка ідзе не пра замену палітыкі, але пра прызнанне таго, што новыя сілы становяцца ўсё больш актуальнымі і здольнымі дасягнуць значных вынікаў у вырашэнні канкрэтных праблем. Некаторыя з іх прадэманстравалі гэта падчас пандэміі. Сам факт таго, што адказы на праблемы могуць прыйсці з любой краіны, якой бы малой яна ні была, у канчатковым выніку прадстаўляе мультылатэралізм як непазбежны працэс.

41. Старая дыпламатыя, таксама прабываючы ў крызісе, усцяж даказвае сваю важнасць і неабходнасць. Ёй усё яшчэ не ўдалося стварыць мадэль шматбаковай дыпламатыі, якая б адпавядала новай канфігурацыі свету, але калі яна здолее перафармуляваць сябе, то павінна стаць часткай рашэння, бо нельга адкідаць вопыт, назапашаны цягам стагоддзяў.

42. Наш свет стаў настолькі шматпалярным і адначасова настолькі складаным, што для эфектыўнага супрацоўніцтва неабходны іншыя рамкі. Недастаткова думаць толькі аб балансе сіл, бо існуе патрэба даць адказ на новыя выклікі і рэагаваць – з дапамогай глабальных механізмаў – на праблемы навакольнага асяроддзя, аховы здароўя, культуры і сацыяльнай сферы, асабліва дзеля таго, каб умацаваць павагу да самых элементарных правоў чалавека, грамадскіх правоў і да клопату аб нашым агульным доме. Гэта пытанне выпрацоўкі глабальных і эфектыўных правілаў, каб забяспечыць гэтую глабальную абарону.

43. Усё гэта прадугледжвае стварэнне новай працэдуры прыняцця рашэнняў і легітымізацыі гэтых рашэнняў, бо тая, што была ўведзена некалькі дзесяцігоддзяў таму, не з’яўляецца дастатковай і эфектыўнай. У гэтым кантэксце безумоўна неабходна прастора для размоў, кансультацый, арбітражу, вырашэння канфліктаў і кантролю і, у рэшце рэшт, своеасаблівая «дэмакратызацыя» ў глабальным кантэксце, каб выявіць і ўлічыць розныя сітуацыі. Больш не будзе карысці ў падтрымцы інстытутаў, якія ахоўваюць правы больш моцных і не клапоцяцца пра правы ўсіх.

**4. Канферэнцыі па клімаце: дасягненні і няўдачы**

44. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў прадстаўнікі больш чым 190 краін перыядычна сустракаюцца для абмеркавання праблемы змены клімату. Канферэнцыя ў Рыа-дэ-Жанэйра 1992 года прывяла да прыняцця Рамачнай канвенцыі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый аб змяненні клімату (РКЗК ААН) – дамовы, якая ўступіла ў сілу пасля неабходнай ратыфікацыі яе падпісантамі ў 1994 года. Гэтыя дзяржавы штогод збіраюцца на Канферэнцыю бакоў (Conference of the Parties – COP), якая з’яўляецца вышэйшым органам прыняцця рашэнняў. Некаторыя з гэтых канферэнцый былі няўдалымі, напрыклад, Капенгагенская (2009), у той час як іншыя дазволілі зрабіць важныя крокі наперад, як COP3 у Кіёта (1997). Яе важны пратакол паставіў мэту скараціць агульныя выкіды парніковых газаў на 5% у параўнанні з 1990 годам. Тэрмін скончыўся ў 2012 годзе, але мэта, відавочна, не была дасягнута.

45. У Кіёта ўсе бакі таксама ўзялі на сябе абавязацельствы па рэалізацыі праграм

адаптацыі, каб паменшыць наступствы кліматычных зменаў, якія ўжо ёсць. Таксама была прадугледжана дапамога для пакрыцця выдаткаў на гэтыя мерапрыемствы ў краінах, якія развіваюцца. Фактычна Кіёцкі пратакол уступіў у сілу ў 2005 годзе.

46. Затым у дачыненні да выкліканых змяненнем клімату страт было прапанавана стварыць механізм, які прызнаў бы найбагацейшыя краіны галоўнымі вінаватымі і імкнуўся б кампенсаваць разбуральныя наступствы пацярпелым краінам. Ідзе гаворка не пра фінансаванне «адаптацыі» гэтых краін, а пра кампенсацыю ўжо нанесенай ім шкоды. Гэтае пытанне было прадметам важных дыскусій на розных канферэнцыях COP.

47. COP21 у Парыжы (2015) сталася чарговым важным крокам, паколькі гэтая канферэнцыя выпрацавала пагадненне, якое ахапіла ўсіх. Яго можна лічыць новым пачаткам, улічваючы невыкананне пастаўленых раней мэтаў. Пагадненне ўступіла ў сілу 4 лістапада 2016 года. Нягледзячы на тое, што пагадненне з’яўляецца абавязковым, не ўсе яго патрабаванні з’яўляюцца абавязацельствамі ў сціслым сэнсе, і некаторыя з іх пакідаюць месца для вялікай свабоды ў прыняцці рашэнняў. Зрэшты, уласна кажучы, ні санкцый у выпадку невыканання абавязацельстваў, ні эфектыўных інструментаў іх выканання не прадугледжана. Пагадненне таксама прадугледжвае пэўную гнуткасць адносна краін, якія развіваюцца.

48. Парыжскае пагадненне ставіць перад сабой важную доўгатэрміновую мэту: утрымаць рост сярэдніх глабальных тэмператур ніжэй за 2°C у параўнанні з даіндустрыяльным узроўнем пры адначасовым іх зніжэнні да 1,5°C. Усё яшчэ не завершана праца па ўзмацненні канкрэтных працэдур маніторынгу і забеспячэнні агульных крытэрыяў для параўнання мэтаў розных краін. Гэта не дае больш аб’ектыўна (колькасна) ацэньваць рэальныя вынікі.

49. Пасля некалькіх канферэнцый з мізэрнымі вынікамі і расчаравання COP25 у Мадрыдзе (2019) можна было спадзявацца, што гэтая інерцыя зменіць накірунак падчас COP26 у Глазга (2021). Галоўным вынікам стаў перазапуск Парыжскага пагаднення, спыненага агульнымі наступствамі пандэміі. Больш за тое, было мноства «рэкамендацый», рэальны эфект ад якіх скадана прадбачыць. Прапановы, якія мелі на мэце забеспячэнне хуткага і эфектыўнага пераходу на альтэрнатыўныя і менш забруджвальныя віды энергіі, не атрымалі развіцця.

50. Канферэнцыя у Шарм-Эль-Шэйху (COP27 у 2022 г.) з самага пачатку была пад пагрозай сітуацыі, якая склалася з прычыны ўварвання ва Украіну, вынікам чаго стаў сур’ёзны эканамічны і энергетычны крызіс. Выкарыстанне вугляроду павялічылася, і кожны імкнуўся мець дастатковыя запасы. Краіны, якія развіваюцца, разглядалі доступ да энергіі і перспектывы развіцця як неадкладны прыярытэт. Было відавочна, што выкапнёвыя віды паліва па-ранейшаму забяспечваюць 80% энергіі ў свеце і што іх выкарыстанне працягвае

расці.

51. Канферэнцыя ў Егіпце стала яшчэ адным прыкладам складаных перамоваў. Можна сказаць, што яна, прынамсі, стала крокам наперад ва ўзмацненні сістэмы фінансавання «страт і шкоды» ў краінах, якія найбольш пацярпелі ад кліматычных катастроф. Здавалася б, гэта надасць новы голас і большую ролю краінам, якія развіваюцца. Але і тут многія моманты заставаліся няяснымі, перш за ўсё, канкрэтная адказнасць краін, якія павінны рабіць свой унёсак.

52. Сёння мы працягваем канстатаваць, што «канчатковыя ўмовы мелі нізкі ўзровень рэалізацыі. Не ўстаноўлена адпаведных механізмаў маніторынгу, перыядычнага перагляду і санкцый у выпадку парушэння пастаноў. Пералічаныя прынцыпы надалей патрабуюць эфектыўныхі хуткіх шляхоў практычнай рэалізацыі» [32]. Акрамя таго, што «Міжнародныя перамовы не могуць значна развівацца з прычыны пазіцыі краін, якія ставяць уласныя нацыянальныя інтарэсы вышэй за глабальнае агульнае дабро.Тыя, хто будзе несці адказнасць за наступствы таго, аб чым мы стараемся прамаўчаць, будуць памятаць пра гэты недахоп сумленнасці і адказнасці» [33].

**5. Чаго чакаць ад COP28 у Дубаі?**

53. Аб’яднаныя Арабскія Эміраты прымуць наступную Канферэнцыю бакоў (COP28). Гэта краіна Персідскага заліва, вядомая як буйны экспарцёр выкапнёвага паліва, хоць яна зрабіла значныя інвестыцыі ў аднаўляльныя крыніцы энергіі. Між тым газавыя і нафтавыя кампаніі плануюць там новыя праекты з мэтай далейшага павелічэння здабычы. Сцвярджэнне, што ад COP28 няма чаго чакаць, па сутнасці, было б дэструктыўным, бо паставіла б пад пагрозу  ўсё чалавецтва, асабліва самых бедных, з прычыны найгоршых наступстваў змены клімату.

54. Калі мы ўпэўненыя ў здольнасці людзей перамагаць свае дробныя інтарэсы і думаць больш шырокімі катэгорыямі, то можам працягваць спадзявацца, што COP28 прывядзе да рашучага паскарэння энергетычнага пераходу, што ўключае таксама эфектыўныя абавязацельствы, якія можна будзе пастаянна кантраляваць. Гэтая канферэнцыя можа стаць паваротным пунктам, паказваючы, што ўсё, што было зроблена з 1992 года, было сапраўды сур’ёзным і вартым высілкаў, інакш яна стане вялікім расчараваннем і пашкодзіць ужо дасягнутаму дабру.

55. Нягледзячы на шматлікія перамовы і пагадненні, памер сусветных выкідаў працягвае расці. Безумоўна, можна сказаць, што без гэтых пагадненняў яны б павялічыліся яшчэ больш. Аднак у іншых сферах, звязаных з навакольным асяроддзем, пры наяўнасці волі, удалося атрымаць вельмі значныя вынікі, як гэта было ў выпадку з аховай азонавага слоя. Аднак неабходны пераход да чыстых крыніц энергіі, такіх як вецер і сонечная энергія, і

адмова ад выкапнёвага паліва не прасоўваецца з дастатковай хуткасцю. Таму ёсць рызыка, што ўсе дзеянні будуць лічыцца толькі спробай адцягнуць увагу.

56. Мы павінны адмовіцца ад звычкі рабіць выгляд заклапочанасці праблемай і не знаходзіць мужнасці для істотных змен. Мы ведаем, што такімі тэмпамі ўсяго праз некалькі гадоў мы пяройдзем максімальную рэкамендаваную мяжу ў 1,5°C, а неўзабаве і 3°C, з высокай рызыкай дасягнення крытычнай кропкі. Нават калі мы не апынёмся ў гэтай кропцы незвароту, упэўнены, што наступствы будуць катастрафічнымі і давядзецца прымаць аператыўныя меры з велізарнымі выдаткамі, а таксама з надзвычай сур’ёзнымі і недапушчальнымі эканамічнымі і сацыяльнымі наступствамі. Нягледзячы на тое, што меры, якія мы можам прыняць зараз, абыдуцца дорага, кошт будзе тым больш цяжкім, чым даўжэй мы чакаем.

57. Я лічу важным настойваць на тым, што «шуканне толькі тэхнічных прэвентыўных сродкаў на кожную праблему аховы навакольнага асяроддзя, якая толькі з’явіцца, азначае ізаляцыю спраў, якія на самай справе звязаны паміж сабою, а таксама ўкрыванне праўдзівых і глыбокіх праблемаў сусветнай сістэмы» [34]. Гэта праўда, што высілкі па адаптацыі неабходныя перад абліччам непазбежных страт у кароткачасовай перспектыве. Таксама станоўчымі з’яўляюцца некаторыя дзеянні і тэхналагічныя дасягненні, якія дазваляюць паглынаць або ўлоўліваць выкіды газаў. Тым не менш, мы рызыкуем застацца ў логіцы латання, заклейвання шчылін і абвязвання дротам расколін, у той час як пад паверхняй трывае працэс дэградацыі, якому мы далей спрыяем. Меркаванне, што ў будучыні ўсе праблемы можна будзе вырашыць новымі тэхнічнымі ўмяшаннямі, – гэта форма згубнага прагматызму, падобнага да снежнага кома, які мы падштурхоўваем з гары.

58. Скончым, нарэшце, з безадказнымі кпінамі, якія прадстаўляюць гэтую праблему як нешта чыста экалагічнае, «зялёнае», рамантычнае, вартае насмешак з пункту гледжання эканамічных інтарэсаў. Прызнаем ужо, што гэта чалавечая і сацыяльная праблема ў шырокім сэнсе і на розных узроўнях, якая патрабуе ўдзелу ўсіх. Часта, падчас канферэнцый па клімаце прыцягваюць увагу дзеянні так званых «радыкальных» груп. Але на самай справе яны запаўняюць пустку, што ўтварылася ў грамадстве ў цэлым, якое павінна аказваць здаровы «ціск», бо кожная сям’я павінна ўсведамляць, што на карту пастаўлена будучыня яе дзяцей.

59. Калі існуе шчырая зацікаўленасць у тым, каб COP28 стала гістарычнай падзеяй, якая прынясе нам гонар і ўзвысіць нас, то можна чакаць вызначэння абавязковых форм энергетычнага пераходу, якія мусілі б адпавядаць тром умовам: эфектыўнасць, абавязковасць і лёгкасць кантролю. Важна дамагчыся пачатку новага працэсу, які быў бы рашучым, інтэнсіўным і мог бы разлічваць на падтрымку ўсіх. Пакуль што гэтага не адбылося, і толькі працэс такога кшталту можа вярнуць давер да міжнароднай палітыкі, бо выключна такім ясным шляхам можна істотна скараціць выкіды вуглякіслага газу і

своечасова пазбегнуць найгоршага зла.

60. Будзем спадзявацца, што тыя, хто прыме ўдзел у канферэнцыі, будуць стратэгамі, здольнымі думаць пра агульнае дабро і будучыню сваіх дзяцей, а не пра абмежаваныя інтарэсы пэўных краін ці кампаній. Няхай такім чынам яны прадэманструюць высакароднасць палітыкі, а не яе ганьбу. Тых, хто мае ўладу, я адважуся яшчэ раз спытаць: «Чаму сёння намагаюцца захаваць уладу, якая не была ў стане ўмяшацца, калі гэта было тэрміновым і неабходным?» [35].

**6. Духоўная матывацыя**

61. Я хацеў бы нагадаць вернікам-католікам аб матывах, якія вынікаюць з іх веры. Я заахвочваю маіх братоў і сясцёр з іншых рэлігій рабіць тое самае, бо мы ведаем, што сапраўдная вера не толькі дае сілу чалавечаму сэрцу, але таксама перамяняе жыццё, змяняе нашыя мэты і асвятляе адносіны з людзьмі і сувязі з усім стварэннем.

*У святле веры*

62. Біблія кажа нам: «І ўбачыў Бог, што ўсё, што Ён зрабіў, было вельмі добрым» (Быц 1, 31). Яму належыць «зямля і ўсё, што на ёй» (Дрг 10, 14). Па гэтай прычыне Ён кажа нам, што зямля «не будзе прадавацца назаўсёды, бо зямля – Мая, вы ж у Мяне прыхадні і пасяленцы» (Лев 25, 23). Такім чынам, «адказнасць за зямлю, якая належыць Богу, азначае, што чалавек, адораны розумам, павінен шанаваць правы прыроды і далікатную раўнавагу паміж істотамі ў гэтым свеце» [36].

63. У той жа час «увесь сусвет, з яго разнастайнымі адносінамі, найлепш паказвае невычарпальнае багацце Бога»; такім чынам, каб быць мудрым, «мы павінны ўхапіць разнастайнасць рэчаў у іх шматлікіх адносінах» [37]. На гэтым шляху мудрасці нам не ўсё роўна, што так шмат відаў знікае і што кліматычны крызіс ставіць пад пагрозу жыццё многіх іншых істотаў.

64. Езус «мог заахвочваць іншых да адчування прыгажосці, якая існуе ў свеце, бо сам быў у пастаянным кантакце з прыродай і звяртаў на яе асаблівую ўвагу, поўную любові і захаплення. Калі праходзіў кожны кавалачак сваёй Айчыны, затрымліваўся, каб захапляцца прыгажосцю, створанай Айцом, заахвочваючы сваіх вучняў распазнаваць у Божых рэчах заклік» [38].

65. Такім чынам, «стварэнні гэтага свету паўстаюць перад намі ўжо не як выключна натуральная рэчаіснасць, бо Уваскрослы таямніча акружае яе і накіроўвае да паўнаты. Тыя самыя дзікія кветкі і птушкі, якімі Ён захапляўся сваімі чалавечымі вачыма, і сёння напоўнены Яго яснеючай прысутнасцю» [39]. Калі «Сусвет развіваецца ў Богу, які яго

цалкам напаўняе… існуе таямніца, якой трэба захапляцца ў лістоце, у сцежцы, у расе, у твары ўбогага» [40]. Свет апявае бясконцую Любоў: як жа нам не клапаціцца пра яго?

*Падарожжа ў камуніі і адказнасці*

66. Бог злучыў нас з усімі сваімі стварэннямі. Тым не менш, тэхнакратычная парадыгма можа ізаляваць нас ад навакольнага асяроддзя і прымусіць забыцца, што ўвесь свет з’яўляецца «кантактнай зонай» [41].

67. Юдэа-хрысціянскае бачанне свету падтрымлівае асаблівую і цэнтральную каштоўнасць чалавека сярод цудоўнага хору ўсіх Божых стварэнняў, але сёння мы вымушаны ўсвядоміць, што падтрымліваць можна толькі «ўгрунтаваны антрапацэнтрызм». Іншымі словамі, прызнаць, што чалавечае жыццё незразумелае і нетрывалае без іншых стварэнняў. Бо «ўсе стварэнні сусвету, створаныя аднымАйцом і з’яднаныя нябачнымі повязямі, ствараюць нешта накшталт універсальнай сям’і, цудоўнай еднасці, якая абуджае да святой, сардэчнай і пакорнай павагі» [42].

68. Такі падыход – не прадукт нашай волі, але  мае іншае паходжанне, якое ляжыць у аснове нашай істоты, паколькі «Бог так цесна злучыў нас з навакольным светам, што знішчэнне і атручванне зямлі з’яўляецца хваробай, якая закранае нас усіх, і мы можам смуткаваць над выміраннем нейкага віду як над нейкім знявечаннем» [43]. Такім чынам, надыйшоў час адмовіцца ад ідэі аўтаномнага, усемагутнага і неабмежаванага чалавека і пачаць думаць пра сябе інакш, з большай пакорай і плённасцю.

69. Запрашаю ўсіх спадарожнічаць гэтаму шляху прымірэння са светам, які гасцінна прымае нас, і рабіць яго прыгажэйшым, бо адданасць гэтай справе спалучана з нашай асабістай годнасцю і найвышэйшымі каштоўнасцямі. Вядома, я не магу запярэчыць, што трэба быць шчырым і прызнаць: найбольшы эфект дадуць не індывідуальныя намаганні, але перш за ўсё вялікія палітычныя рашэнні на нацыянальным і міжнародным узроўні.

70. Між тым, нават дробязі ўплываюць на агульны стан, і, калі ўдасца пазбегнуць павышэння глабальнай тэмпературы на дзесятую долю градуса, гэтага ўжо будзе дастаткова, каб многіх людзей пазбавіць ад пакут. Але важна звярнуць увагу на штосьці менш колькаснае: трэба ўсвядоміць, што няма трывалых зменаў без культурных, без сталення стылю жыцця і грамадскіх перакананняў, і што няма культурных зменаў без зменаў асабістых.

71. Намаганні хатніх гаспадарак скараціць забруджванне і колькасць адкідаў, а таксама іх зацікаўленасць у разважлівым спажыванні ствараюць новую культуру. Ужо сам факт, што асабістыя, сямейныя і грамадскія звычкі змяняюцца, спрыяе большай незадаволенасці з нагоды нявыкананых абавязкаў палітычнага сектара і абурэнню з-за абыякавасці ўладаў. Такім чынам, давайце ўсвядомім, што нават калі гэта не дае адразу прыкметнага выніку з

колькаснага пункту гледжання, мы дапамагаем распачынаць вялікія працэсы трансфармацыі, якія дзейнічаюць з глыбіні грамадства.

72. Калі ўлічыць, што выкіды на душу насельніцтва ў Злучаных Штатах прыкладна ў два разы большыя, чым у Кітаі, і прыкладна ў сем разоў большыя, чым у сярэднім у самых бедных краінах [44], то можам канстатаваць, што паўсюдная змена безадказнага ладу жыцця, спалучанага з заходняй мадэллю, магла б мець значныя доўгатэрміновыя наступствы. У выніку, разам з неабходнымі палітычнымі рашэннямі, мы крочылі б па дарозе да сапраўднага ўзаемнага клопату.

73. Гэты ліст названы «Хвала Богу», бо чалавек, прэтэндуючы на месца Бога, сам для сябе становіцца найбольшай небяспекай.

*Дадзена ў Рыме, у базыліцы св. Яна на Латэране, 4 кастрычніка 2023 года, ва ўспамін св. Францішка Асізскага, у адзінаццаты год майго Пантыфікату.*

ФРАНЦІШАК

---

[1] Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў ЗША, *Global Climate Change Background*, 2019.

[2] Спецыяльная асамблея Сіноду Біскупаў для рэгіёну Панамазоніі, *Заключны дакумент*, кастрычнік 2019, 10: AAS 111 (2019), 1744.

[3] Сімпозіум біскупскіх канферэнцый Афрыкі і Мадагаскара (SCEAM), *Камюніке афрыканскіх кліматычных дыялогаў*, Найробі, 17 кастрычніка 2022 г.

[4] Пар. Intergovernmental Panel on Climate Change (IPCC), *Climate Change 2021, The Physical Science Basis*, Cambridge and New York 2021, B.2.2.

[5] Пар. тое самае, *Climate Change 2023, Synthesis Report, Summary for Policymakers*, B.3.2. Спасылка на справаздачу 2023 ahttps://www.ipcc.ch/report/ar6/syr/downloads/report/IPCC_AR6_SYR_SPM.pdf.

[6] Пар. United Nations Environment Program, *The Emissions Gap Report 2022*: https://www.unep.org/resources/emissions-gap-report-2022.

[7] Пар. National Oceanic and Atmospheric Administration, Earth System Research Laboratories, Global Monitoring Laboratory, *Trends in Atmospheric Carbon Dioxide*: https://www.gml.noaa.gov/ccgg/trends/.

[8] Пар. IPCC, *Climate Change 2023, Synthesis Report, Summary for Policymakers*, A.1.3.

[9] Пар. тамсама, B.5.3.

[10] Questi dati dell'Intergovernmental Panel on Climate Change (IPCC) sono basati su circa 34.000 studi: пар. IPCC, *Synthesis Report of the Sixth Assessment Report (20/03/2023): AR6 Synthesis Report: Climate Change 2023 (ipcc.ch)*.

[11] Пар. IPCC, *Climate Change 2023, Synthesis Report, Summary for Policymakers*, A.1.2.

[12] Пар. *тамасама*.

[13] Энц.*Laudato si'*(24 мая 2015), 101.

[14] *Тамсама*, 105.

[15] *Тамсама*, 106.

[16] *Тамсама*, 104.

[17] *Тамсама*, 105.

[18] *Тамсама*, 139.

[19] *Тамсама*, 220.

[20] Пар. S. Sörlin – P. Warde, *Making the Environment Historical. An Introduction*, in Iidem, *Nature's End: History and the Environment, Basingstoke* – New York 2009, 1-23.

[21] Энц.*Laudato si' (*24 мая 2015), 139.

[22] V. Solov'ëv, *I tre dialoghi e il racconto dell'Anticristo*, Bologna 2021, 256.

[23] Пар. Св. Павел VI, *Discorso alla FAO nel suo 25 anniversario* (16 лістапада 1970), 4: AAS 62 (1970), 833.

[24] Энц. *Fratelli tutti* (3 кастрычніка 2020), 11.

[25] *Тамсама*, 174.

[26] *Тамсама*, 172.

[27] *Тамсама.*

[28] Пар. *тамсама*, 170:

[29] *Тамсама*.

[30] *Тамсама*, 175.

[31] Энц.*Laudato si'*(24 мая 2015), 179.

[32] *Тамсама*, 167.

[33] *Тамсама*, 169.

[34] *Тамсама*, 111.

[35] *Тамсама*, 57.

[36] *Тамсама*, 68.

[37] *Тамсама*, 86.

[38] *Тамсама*, 97.

[39] *Тамсама*, 100.

[40] *Тамсама*, 233.

[41] Пар. D. J. Haraway, *When Species Meet*, Minneapolis 2008, 205-249.

[42] Энц.*Laudato si'*(24 мая 2015), 89.

[43] Апост. адг.*Evangelii gaudium* (24 лістапада 2013), 215.

[44] Пар. United Nations Environment Program, *The Emissions Gap Report 2022*: https://www.unep.org/resources/emissions-gap-report-2022.

Copyright © Dicastero per la Comunicazione - Libreria Editrice Vaticana